# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ІНВАЛІДНАСЦІ

***І. В. Пархоменка***
***Белорусский государственный университет***

У наш час не выклікае сумневу тое, што інваліднасць як з'ява маштабнага характару патрабуе свайго неадкладнага вырашэння на прыкладным узроўні (неабходнасць стварэння новай сістэмы сацыяльнай работы з інвалідамі, распрацоўкі інавацыйных методык рэабілітацыі, сацыяльнай адаптацыі і г. д.). Але перш, чым падысці да канкрэтных практычных мерапрыемстваў па аптымізацыі становішча людзей з абмежаванымі магчымасцямі, неабходна высветліць прычыны неаднолькавага ўспрымання гэтага феномену ў розных сацыяльных умовах і краінах, даць яго адэкватную тэарэтычную інтэрпрэтацыю.

Шматлікія сацыялагічныя канцэпцыі разглядаюць інваліднасць менавіта з пункту гледжання яе сацыяльнага канструявання грамадскімі сістэмамі на базе ведаў пра функцыянальную норму і адхіленне. Згодна тэорыі ўлады Фуко, дыягназ фізічнай паталогіі літаральна ставіць забарону на чалавеку і аўтаматычна гвалтоўна выключае яго з усіх сфер грамадскага жыцця, дзе ўлада бярэ на сябе ролю наглядчыка і кантралёра гэтага працэсу. З пазіцыі тэорыі сацыяльнага канструктывізму інваліднасць можа неаднолькава ўспрымацца рознымі сацыяльнымі сістэмамі. Часта такі стан разумеецца не толькі як фізіялагічная паталогія чалавечага арганізму, але і як сацыяльнае вызначэнне – «ярлык», які ў дадзенай сістэме лічыцца адхіленнем ад нормы. Але праз пераход у

іншую сацыяльную групу чалавек можа зняць з сябе гэты ярлык ці ў нейкай сіупені змяніць яго[3, с. 39].

Падобнай думкі прытрымліваецца і тэорыя сімвалічнага інтэракцыянізму, дзе ўводзіца паняцце «стыгма» (кляймо, пляма), якое таксама разглядаецца як адхіленне ад нормы, а ступень яе праявы залежыць ад месца і часу атрымання інваліднасці. Так, напрыклад, дзеці з асаблівасцямі развіцця, якія жывуць у сем'ях, да нейкага часу знаходзяцца ў інфармацыйна абароненым вакууме; дарослыя пасля набыцця стыгмы ўжо ведаюць, што ёсць норма і паталогія (эфект непазнавання сябе)[3, с. 43].

У пэўным сэнсе новым накірункам айчыннай сацыялогіі стаў стратыфікацыйны аналіз інваліднасці, згодна з якім "не прыродныя дадзеныя, а менавіта грамадства дыскрымінуе індывідаў і іх сем'і, пазбаўляючы іх сацыяльных правоў, узнаўляючы няроўнасць і сацыяльную стратыфікацыю"[3, с. 40]. Найбольшым прэстыжам у грамадстве валодае той, хто здольны ажыццяўляць гвалт над іншымі людзьмі і прыродай або эфектыўна супрацьстаяць такому гвалту. Людзі з абмежаванымі магчымасцямі застаюцца самымі неабароненымі ў гэтым плане і, адпаведна, аўтаматычна займаюць ніжэйшую прыступку ў сацыяльнай іерархіі [3, с. 41].

Прадстаўленае ў дадзенай працы бачанне праблемы інваліднасці заходзіць з парадыгмы траўмы П. Штомпкі. З гэтага выцякае з'яўленне так званага феномену «сацыяльных траўм», што, верагодна, з'яўляецца асноўнай прычынай станаўлення глабальнай грамадскай «інвалідызацыі».

*Сацыяльныя траўмы* – гэта такія грамадскія трансфармацыі, якія рэалізуюцца ў непрадбачаных траўматычных сітуацыях, валодаюць часавай характарыстыкай, пэўным зместам і размахам, вытокамі і ўспрымаюцца як нешта нечаканае, непрадказальнае. Працей гэтае паняцце можна аперацыяналізаваць як стан напружання, звязаны з канкрэтнымі сацыяльнымі зменамі [1, с. 8 ].

Сацыяльныя траўмы носяць цыклічны характар, паколькі ў шэрагу асаблівасцяў гэтай з'явы можна вылучыць іх перыядычную паўтаральнасць з большай ці меншай частатой (залежыць ад ступені развітасці краіны). Зыходзячы з дадзенай характарыстыкі, дапушчальным становіцца меркаванне, што колькасць і маштаб сацыяльных траўм непасрэдным чынам вызначаюць ступень «інвалідызацыі» кожнага канкрэтнага грамадства той ці іншай краіны, і гэта знаходзіць сваё выяўленне ў нарастанні глабальных супярэчнасцяў і канфліктаў. Неабходна падкрэсліць, што ў дадзеным выпадку выраз "інвалідызацыя грамадства" мае на ўвазе не толькі наяўнасць нейкай

колькасці інвалідаў у пэўным рэгіёне, а і ўсе негатыўныя эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя наступствы сацыяльных траўм, якія ствараюць нестабільнасць у соцыуме.

У сваёй канцэпцыі Штомпка лічыць, што чым большы разрыў паміж звыклым арганізаваным асяроддзем і ўмовамі, выкліканамі траўматычнай падзеяй ( чым мацней «шок»), а таксама чым больш траўма закранае сферу калектыўных базавых каштоўнасцяў – тым мацней яна адчуваецца [1, с. 10]. Так, напрыклад, у стабільным сацыяльна і эканамічна спрыяльным грамадстве рэзкае ўзрастанне ўзроўню інваліднасці насельніцтва выкліча калектыўную “траўму”, а ў рэгіёне, звыклым да падобных сітуацый, павелічэння колькасці інвалідаў могуць проста не заўважыць.

Сёння ў Беларусі не існуе вялікага разрыву паміж асяроддзем і ўмовамі, выкліканымі глабальнай траўмай напачатку 90-х гадоў. Менавіта таму ў нашым грамадстве, на працягу болей чым дзесяцігоддзя ахопленага глабальным посттраўматычным крызісам, такая з’ява, як інваліднасць насельніцтва, застаецца малазначнай і незаўважнай.

Для нашай краіны па-ранейшаму характэрна прагматычнае стаўленне да інвалідаў, якое характарызуецца абыякавасцю людзей і іх засяроджанасцю на паўсядзённых клопатах. Пасіўнасць, апатыя, сіндром незацікаўленасці – гэта сімптомы, характэрныя для сацыялістычнай мадэлі паводзінаў [2, с. 6], якая паступова пачала мяняцца толькі пасля наступстваў глабальнай сацыяльнай траўмы. Змена такой негатыўна-пасіўнай пазіцыі ў дачыненні да інвалідаў на актыўна-стваральную з’яўляецца адной з асноўных задач усіх сацыяльных арганізацый, інстытутаў, галін навукі, якія займаюцца праблемамі інваліднасці. Канцэпцыя «сацыяльнай траўмы» падкрэслівае магчымасць паспяховага пераадолення крызісу глабальнай грамадскай “інвалідызацыі” толькі ў выпадку прымянення карэнных інавацый, што павінна прывесці да станоўчай змены папярэдняй культуры і паводзінаў людзей.

Абапіраючыся на тэорыю «сацыяльных траўм» Штомпкі, можна з высокай верагоднасцю меркаваць, што інваліднасць будзе неаднолькава ўспрымацца ў розных грамадствах, і гэта будзе залежаць ад глыбіні і маштабу «траўматызму» таго ці іншага рэгіёну. Грамадства, ахопленае шматлікімі «сацыяльнымі траўмамі» (асабліва калі яны закранаюць культурны ўзровень), знаходзіцца ў так званым «полі інвалідызацыі», якое характарызуецца: павышанай стрэсагеннасцю; наяўнасцю вялікай колькасці сацыяльных канфліктаў і супярэчнасцяў; сацыяльнай напружанасцю і дысбалансам; няўстойлівасцю; адсутнасцю або запаволенымі тэмпамі ўспрымання станоўчых змен.

Апошні пункт характарызуе грамадства падчас сацыяльных траўм як пасіўнае, «спячае», дзе індывіды не ў стане ўспрымаць праблемы, якія не тычацца іх саміх, як рэальна існуючыя. Падчас такіх крызісаў інваліднасць разглядаеца як сімулякр, рэальнасць, якой не існуе, а ў якасці замацавання гэтага прынцыпу выступае ўжо вядомы штучна створаны падзел на норму і дэвіяцыю. У соцыуме, які знаходзіцца ў «полі інвалідызацыі», інтарэсы інвалідаў і іншых людзей так ці інакш сутыкаюцца паміж сабой, выклікаючы фрустрацыю і агрэсію з боку «здаровай» большасці. Менавіта несупадзенне інтарэсаў, патрэб і заклікаў, што яшчэ мацней напружвае «поле інвалідызацыі», становіцца штуршком для накладання на інваліда ярлыка нетыповасці і заганнасці з вынікаючымі адсюль санкцыямі за парушэнне гэтай новай нормы. Пасля пераадолення наступстваў сацыяльных траўм і ўзнаўлення стабільнасці ў грамадстве гэтыя рамкі абмежаванасці дзейнасці інвалідаў часткова або цалкам здымаюцца, што дазваляе людзям з абмежаванымі магчымасцямі стаць паўнацэннымі членамі соцыума да моманту чарговага сацыяльнага крызісу. Такім чынам, увесь працэс накладання і зняцця ярлыкоў праходзіць па вядомай трыядзе: *напруга* (нарастанне сацыяльных супярэчнасцяў) – *крызіс* (узнікненне сацыяльных траўм, што абумоўлівае накладанне ярлыкоў) – *разрадка* (зняцце або замена былых ярлыкрў на менш жорсткія).

Прыведзеная канцэпцыя таксама зыходзіць з пазіцый сацыяльнага канструявання інваліднасці, але яе адметнай асаблівасцю з’яўляецца тое, што ўспрыманне інваліднасці тут разглядаецца як вынік аб’ектыўна абумоўленых сацыяльна-эканамічных, палітычных, культурных працэсаў, што прыводзяць да глыбінных грамадскіх трансфармацый. Тое, якім будзе стаўленне да людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў канкрэтным грамадстве, залежыць ад ступені глыбіні і маштабу існуючых у ім «сацыяльных траўм».

Вялікай колькасцю такіх «траўм», якія закранаюць і біялагічны, і сацыяльны, і культурны ўзроўні, тлумачыцца феномен татальнай стэрэатыпізацыі інваліднасці ў Беларусі. Пераадоленне гэтага магчыма толькі праз карэнную “рэабілітацыю” ўсяго беларускага соцыума падчас глыбіннага постсавецкага крызісу, якая павінна ісці паралельна з рэабілтацыяй саміх інвалідаў.

**Літаратура**


1. *Штомпка П.* Социальные изменения как травма // Социс. 2001. № 1 С. 8-10.
2. *Штомпка П.* Культурная травм в посткоммунистическом обществе // Социс. 2001. № 2. С.6.

3. *Ярская-Смирнова Е. Р.* Социальное конструирование инвалидности // Социс. 1999. № 4. С. 39-43.